УДК 821.161.3

# АСАБЛІВАСЦІ ВОБРАЗАЎ СТАЛІНА І ГІТЛЕРА Ў П'ЕСЕ ІВАНА ЧЫГРЫНАВА "ІГРАКІ"

**Караткевіч Вячаслаў Іванавіч**
старшы выкладчык кафедры літаратуры і міжкультурных камунікацый
установы адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова"
(г. Магілёў, Беларусь)

Пачынаючы з часоў хрушчоўскай адлігі ў савецкай літаратуры замацавалася стратэгія адлюстравання рэжымаў Сталіна і Гітлера як падобных. Гэтая ідэя бярэ свой пачатак з рамана Васіля Гросмана "Жыццё і лёс" (1960), дзе эсэсавец Ліс даводзіць: "И над нашим народным государством красное рабочее знамя, и мы зовем к национальному и трудовому подвигу и единству, и мы говорим: «Партия выражает мечту немецкого рабочего». И вы говорите: «Народность, труд». Вы, как и мы, знаете: национализм – главная сила двадцатого века. Национализм – душа эпохи! Социализм в одной стране – высшее выражение национализма!

<…> На земле есть два великих революционера: Сталин и наш вождь. Их воля родила национальный социализм государства. Для меня братство с вами важней, чем война с вами из-за восточного пространства. Мы строим два дома, они должны стоять рядом. <…> Потом Сталин многому нас научил. Для социализма в одной стране надо ликвидировать крестьянскую свободу сеять и продавать, и Сталин не задрожал – ликвидировал миллионы крестьян. Наш Гитлер увидел, – немецкому национальному, социалистическому движению мешает враг – иудейство. И он решил ликвидировать миллионы евреев. Но Гитлер не только ученик, он гений! Ваше очищение партии в тридцать седьмом году Сталин увидел в нашем очищении от Рема – Гитлер тоже не задрожал…" [1, с. 304–305]. Падобныя думкі не раз пазней знаходзілі сваё адлюстраванне ў творах розных савецкіх і постсавецкіх пісьменнікаў ("Генерал і яго армія" Г. Уладзімава, "Пастка" і "Пакахай мяне, салдацік… В. Быкава", "Карнікі" А. Адамовіча), больш за тое, стала зыходным пунктам пры абмалёўцы Сталіна і Гітлера ў мастацтве. Не выключэннем тут з'яўляецца і п'еса Івана Чыгрынава "Ігракі" (1989).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У дадзеным творы асобы правадыроў Савецкага Саюза і Германіі паказаны ў працэсе своеасаблівай інтэлектуальнай гульні, якую яны спрабуюць навязаць адзін другому. Драматург імкнецца "ачалавечыць", мусіць, самых вядомых дыктатараў XX стагоддзя, паказваючы іх упершыню рэцыпіенту ў дамашняй абстаноўцы, у зусім "негераічнай" вопратцы: Сталін сядзіць у сваёй кватэры за сталом у суконных панчохах, у вязанай блузе [2, с. 112], а Гітлер спіць у ложку [2, с. 138].

Для Івана Чыгрынава важна паказаць псіхалагічныя партрэты кіраўнікоў-дыктатараў праз выкананне імі розных сацыяльных роляў.

Сталін з'яўляецца клапатлівым бацькам, але пры гэтым нікчэмным каханкам, які здольны да абразы сваёй памерлай жонкі Надзеі, помслівым і крыўдлівым. "[Сталін (чакае Молатава)] Я ўсё думаю, Вячаслаў, чаго ёй не хапала? [Молатаў] Жанчыны, Коба, бадай, самыя незразумелыя істоты на зямлі. [Сталін] І **самыя брудныя** [тут і далей вылучана намі. – *В.К.*]. Але **дараваць не магу**. І Алілуевых таму **трываць не магу. І ўсіх**…" [2, с. 120]. У свядомасці савецкага кіраўніка вымалёўваецца своеасаблівая мадэль сусветнага парадку: "Унутраных ворагаў знішчылі амаль усіх. **Народ стаў шчаслівы**. У Еўропе – вайна, а ў нас ціха. І японцаў правучылі, і фіны заціхлі – усё-ткі Кольскі паўвостраў зноў у нас і Выбарг пры ім. Ну, а што Хельсінкі не ўзялі, дык…" [2, с. 120]. Галоўным дзелавым крытэрыем становіцца адданасць кіраўніку: "З кадрамі ў дзяржавы заўсёды клопат. Пры Леніне мы падбіралі іх проста – па дзелавых якасцях ды партыйнай прыналежнасці. Цяпер гэтага мала. Практыка сацыялістычнага будаўніцтва паказала, што не менш важнай якасцю з'яўляецца звычайная чалавечая вернасць. Думаеш, чаму я Берыю перавёў у Маскву з Каўказа?" [2, с. 121]. Для Сталіна людзі – усяго толькі пешкі ў яго гульні: можна запрасіць Варашылава на вячэру, каб паспяваў, паскакаў ды пацешыў. Асобай увагі заслугоўвае эпізод, у якім Коба на свае вушы хоча паслухаць садысцкую гісторыю забойства Троцкага і ў выніку атрымлівае ад гэтага задавальненне: "[Берыя] <…> Што скажаш, Коба? [Сталін] Акрамя задавальнення нічога не скажу" [2, с. 126]. Галоўнай сваёй зброяй і дыктатар лічыць знешнюю прастату: "У нашай гульні з Гітлерам – гэта вялікая зброя. Дарэмна некаторыя не разумеюць. Ды і Гітлер наўрад ці здагадваецца. Няхай думае, што мы звычайныя вясковыя прасцякі" [2, с. 133].

Гітлер – вобраз менш распрацаваны. Іван Чыгрынаў засяроджвае ўвагу на педантычнасці нямецкага лідара (прачынаецца ў 10 гадзін, раніцай п'е сок і чытае газету). Пры гэтым дастаткова хваравіты, бо радуецца таму, што спаў без таблетак. Гітлер лічыць сябе занадта хітрым і разумным ігракам у палітыцы, бо можа нават саступіць апаненту дзеля будучых вялікіх перамог: "Што ж давядзецца пацярпець і гімн камуністаў. Выдумка гэта ўсё – інтэрнацыянал рабочых і сялян. Патрэбны ён ім, як свінні акуляры. Іншая справа яўрэйскі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

інтэрнацыянал банкіраў-біржавікоў. Тут неабходна пільным быць. Не веру я рускім, што гэта ў іх надоўга – інтэрнацыянал. Але няхай. Хутка мы навядзём там парадак. А пакуль – прымусім Сталіна прыняць удзел у адной гульні. Няхай пабудзе таксама іграком. Толькі карты не станем адкрываць яму. Тым больш што некаторыя ягоныя карты мы ўжо ведаем. Паглядзім хто каго” [2, с. 142]. Гітлер здольны да нізкай хлусні дзеля дасягнення мэт і можа здзейсніць самыя нізкія ўчынкі дзеля ўласных мэт. Больш за тое, у гэтага чалавека маецца своеасаблівае разуменне патрыятызму, Гітлер пакутуе ад таго, што яго краіна не мае калоній: “Ваша краіна [СССР – *В.К.*], панове, і Амерыка маюць уласныя вялікія тэрыторыі. Англія валодае чацвёртай часткай свету. У малых дзяржаў, такіх, як Іспанія і Партугалія, таксама ёсць калоніі. Толькі адной Германіі ўсе даводзяць, што яна ні пры якіх умовах не павінна выходзіць за свае межы. У нас забралі нашы калоніі, разбурылі наш гандаль, укралі наш флот!” [2, с. 161]. І. Чыгрынаў звяртае ўвагу на вельмі важную і актуальную, на жаль, праблему непарушнасці дзяржаўных межаў і палітыку прыніжэння адной краіны, што дае магчымасць нараджацца фашызму. Гітлер не ўмее правільна расставіць акцэнты ў сваёй барацьбе, недаацэньвае Сталіна. Высока ацэньваючы ваенны патэнцыял англійскай арміі, ён не бярэ ў разлік чалавечы патэнцыял савецкіх людзей. Два дыктатары, два вельмі разумныя чалавекі перайгралі самі сябе. За іх самаўпэўненасць расплаціліся народы Германіі і Савецкага Саюза надта дарагой цаной.

Цэласны аналіз вобразаў Сталіна і Гітлера ў п’есе І. Чыгрынава “Ігракі” дазваляе нам зрабіць наступныя высновы.

Іван Чыгрынаў пры абмалёўцы вобразаў правадыроў Савецкага Саюза і Германіі выкарыстоўвае традыцыйную мастацкую стратэгію (яна была запачаткавана ў гады хрушчоўскай адлігі), ставячы знак роўнасці паміж гэтымі дзвюма асобамі. Прычым Сталін і Гітлер паказваюцца як маштабныя фігуры ў сусветнай палітыцы, для якіх лёсы мільёнаў – усяго толькі разменная манета ў іх інтэлектуальнай гульні.

Пры абмалёўцы вобразаў выкарыстоўваецца наступны інструментарый: Сталін і Гітлер паказваюцца паперамена, што стварае ўражанне паралельнасці дзеяння, амаль поўнасцю адсутнічаюць намёкі на этычныя ацэнкі дзеянняў і ўчынкаў галоўных дзейных асоб, кожны з “ігракоў” упэўнены, што сваёй гульнёй выконвае важную грамадзянскую і дзяржаўную місію, кожны здольны на праявы душэўнасці (“паэтызацыя” другога боку асобы дыктатара), абодва правадыры ўпэўнены ў сваёй праваце, прычым гэта ўпэўненасць даволі часта мяжуе з самаўпэўненасцю.

Падобныя ўстаноўкі фарміруюць у масавай свядомасці іншы імідж узорнай дыктатуры XX стагоддзя. З аднаго боку, прымушаючы крытычна ацэньваць тое, што ўяўляецца ўжо агульным месцам у поп-культуры мяжы



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

XX і XXI стагоддзяў адносна ацэнкі асоб Сталіна і Гітлера, а таксама іх злачынстваў перад уласным народам і перад чалавецтвам. З другога, дазваляе спраецырываць сітуацыю на сучаснасць, дзе існуе рэальная пагроза выбуху новай вайны, дзе свет "разыгрываецца" паміж моцнымі асобамі без уліку магчымых ахвяр і выдаткаў.

**Літаратура**


1. Гроссман, В. С. Жизнь и судьба : роман / В. С. Гроссман. – Минск : Выш. шк., 1990. – 672 с.
2. Чыгрынаў, І. Звон – не малітва : драмы / І. Чыгрынаў. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 398 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова